В. В. НІКІФАРАВА

# НА ПОДСТУПАХ ДА ВЯЛІКАЙ ПРОЗЫ
## (З творчай гісторыі рамана Янкі Брыля «Граніца»)

Лёс Брыля-раманіста складаны і, бадай, не мае аналогій з творчасцю іншых пісьменнікаў. Па-першае, таму што Я. Брыль — прызнаны майстар апавядання, навелы, кароткай лірычнай аповесці — ішоў да свайго рамана «Птушкі і гнёзды» (1962—1964) праз дзесяцігоддзі творчых пошукаў. Па-другое, таму што вынік гэтых пошукаў узбагаціў беларускую савецкую літаратуру цікавай жанравай разнавіднасцю лірызаванага рамана (П. Дзюбайла). І для пісьменнікаў, і для даследчыкаў становіцца відавочным: лірычны падыход да адлюстравання рэчаіснасці не супярэчыць раманнай форме, раманнаму мысленню, іх умелае спалучэнне дае цікавыя вынікі.

Лепшыя рысы, наватарская сутнасць «Кнігі адной маладосці» Я. Брыля былі, вядома, абумоўлены і магутным узлётам беларускага рамана ў 60-я гады, і поспехамі савецкай лірычнай прозы, якая ў той час усё больш адчувальна ўплывала на жанравую структуру эпічных твораў. Разам з тым станоўчую ролю адыграў тут вопыт, набыты пісьменнікам у працы над раманам «Граніца» (канец 40-х — пачатак 50-х гадоў). Да яго творчай гісторыі варта звярнуцца, каб разгледзець вытокі наватарства Я. Брыля ў галіне раманнага жанру.

Над сваім першым раманам Я. Брыль пачаў працаваць у кастрычніку 1947 года. Пісьменнік бачыў свой твор у перспектыве «вялікім эпічным палатном», дзе ўсебакова будзе адлюстравана народная барацьба за ўз'яднанне Беларусі. Таму ён выбраў досыць працяглы часовы прамежак: 1933—1939 гады. У першым варыянце «Граніцы» дзеянне пачыналася ў 1932 годзе [1], але потым аўтар пераносіць яго ў год, калі Гітлер захапіў у Германіі ўладу. Такім чынам пашыраўся сусветна-гістарычны кантэкст падзей рамана, пісьменнік падкрэсліваў: антысанацыйная барацьба — гэта і барацьба антыфашысцкая.

Героямі твора павінны былі стаць «рабочыя, сяляне і працоўная інтэлігенцыя, лепшыя прадстаўнікі беларускага, польскага і яўрэйскага насельніцтва і, з другога боку, цёмныя сілы белапольскай рэакцыі»[2], што таксама сведчыць пра ўстаноўку Я. Брыля на ўсеабдымнае адлюстраванне гістарычных падзей.

Найбольш інтэнсіўная работа над «Граніцай» (згодна з аўтарскім азначэннем) вялася з кастрычніка 1947 па сакавік 1949 года. За гэты час Я. Брыль тройчы публікаваў урыўкі з рамана ў перыядычным друку, магчыма, каб яшчэ раз праверыць сябе па рэакцыі чытачоў і крытыкі. У маі 1949 года выйшла часопісная рэдакцыя першай часткі з прысвячэннем: «Светлай памяці Валянціна Таўлая — змагара, чалавека і друга»[3]. У тым жа годзе яна была змешчана ў зборніку «Вераснёвая рунь», дзе да назвы першай часткі — «Напярэдадні» — далучыўся падзагаловак «аповесць». Напэўна, у ходзе працы над раманам аўтар вырашыў пабудаваць яго з адносна самастойных частак. Да твораў невялікага фармату Брыль паспеў ужо прызвычаіцца і цяпер імкнецца выкарыстаць гэты вопыт. Дарэчы, такім структурным прынцыпам—«раман з аповесцей» — Брыль будзе потым карыстацца ў «Птушках і гнёздах».

Аднак былі, безумоўна, і іншыя прычыны драблення кампазіцыі рамана, напрыклад, множнасць падзейных планаў. У «Напярэдадні» рэчаіснасць адлюстроўваецца ў трох асноўных сферах: жыццё заходнебеларускага сялянства, падпольная барацьба за вызваленне краю і варожы лагер. Апошні ўяўляе сабою не столькі асобны план апавядання, колькі сукупнасць персанажаў — антаганістаў галоўных герояў. І нельга не заўважыць, што, выводзячы на сцэну галынкаўскага кулака Мацюху і драпежнага хутаранца Якаўца, захмялелага ад улады асадніка Нітку і вытанчанага ката Мармавіцкага, Я. Брыль бліскуча карыстаецца сатырычнымі сродкамі.

Сюжэтных ліній у «Напярэдадні» вызначаецца дзве. Першая звязана з сялянскімі падзеямі (роля яе цэнтральнага героя спачатку належыць Васілю Кужалевічу, потым усё больш прыкметнае месца адводзіцца вобразу Івана Дармы)[4], другая — з падпольнай барацьбой (тут падзеі аб'яднаны вобразам Юркі Кужалевіча, старэйшага брата Васіля). Пісьменнік вырашыў будаваць твор па прынцыпу эпізадычнага чаргавання гэтых двух планаў.

Такая кадрыраваная кампазіцыя вынікае яшчэ і з таго, што абедзве сюжэтныя лініі не зусім аднародныя па якасці мастацкага матэрыялу. Найбольш свабодна Я. Брыль адчувае сябе там, дзе расказвае пра клопаты, радасці і нягоды сям'і Кужалевічаў, пра вясковага байдуна Макара Костачку і маўклівага рабацягу Хаіма Бусла, пра паэтычнае каханне Васіля і Жэні, пра маленькага летуценніка — ці не будучага паэта?— Вальку. Усё гэта для пісьменніка роднае, састаўляе частку яго жыццёвага вопыту і таму ўзнаўляецца ў рамане ў надзвычай маляўнічых, пластычных карцінах-эпізодах — так, як існуе ў асабістай памяці аўтара. Такім чынам, істотнай перадумовай кадрыраванай кампазіцыі з'яўляюцца і індывідуальныя асаблівасці светабачання пісьменніка, яго пераважна пачуццёвае пранікненне ў сутнасць жыццёвых з'яў, бо на «адзіным дыханні», пачуцці здольныя трымацца толькі творы невялікага памеру (В. Каваленка).

У адлюстраванні падполля пачуццёвае спасціжэнне рэчаіснасці абмежавана. Тут Я. Брыль вымушаны пераўтвараць паэтычнай фантазіяй ужо не асабісты, а часцей за ўсё чужы вопыт, дакумент, гістарычны факт. І ў арганізацыі гэтай сюжэтнай лініі пісьменнік спрабуе абаперціся на традыцыю — выкарыстаць законы прыгодніцкага апавядання (так, загадкавы «таварыш Андрэй» у канцы першай часткі аказваецца Юркам Кужалевічам). Аднак здаецца, што аўтару неяк няўтульна ў абстаноўцы явачных кватэр, сутычак з паліцыяй і пабегаў. Ён нават дзе-нідзе аддае перавагу публіцыстычным адступленням, каб самому паведаміць, напрыклад, пра агульны палітычны стан у Польшчы 30-х гадоў. Відавочна, не ўсё з таго, што хацеў сказаць пісьменнік, укладвалася ў сюжэт. Больш таго, зладжаны падзейны сюжэт з прыгодніцкімі элементамі, цалкам аб'ектыўнае апавяданне-хроніка, дзе розныя планы адлюстравання чаргуюцца са зменай пункту погляду на падзеі, не задавальнялі Я. Брыля, пісьменніка лірычнага кірунку, якому патрэбна актыўная роля.

У выніку традыцыйнае ўяўленне аб форме рамана як выключна аб'ектыўнай уступіла ў канфлікт з суб'ектыўна-лірычнай манерай пісьменніка. Спачатку Я. Брыль спрабаваў пераадолець сябе, схаваць уласнае «я». Дзеля гэтага ён давярае свае думкі і ацэнкі таму ці іншаму персанажу. І ўсё ж такі пісьменнік не пераўвасабляецца ў сваіх герояў. Ён «бачыць іх наскрозь», ведае кожны рух душы, але разам з тым застаецца самім сабою, вольны зліваць свой голас з голасам героя ў лірычным маналогу альбо рашуча адмаўляцца ад варожай яму пазіцыі. Напрыклад: «Дарагія, крутыя, зялёныя ўзгоркі маёй Наваградчыны!.. Яшчэ б разочак толькі нырнуць пад галлё, заблытацца босымі нагамі ў кветках, упасці тварам на расу, прысмаліць крапівой раскаваныя рукі...»[5]— так думае, адчувае Іван Дарма, а разам з ім і сам аўтар. Альбо: «... пакуль яны ішлі, а потым ён угаварваў «пана солтыса» не агінацца, а зайсці на двор і ў хату — буйны хмель неяк зусім непажадана выветраў і ў ачмурэлай мазгаўні засталося нешта тупое, бязвольнае. Проста ные, шчыміць, хоць пайдзі ды зваліся пад плотам. Мацюха — хітры хам!— ніяк не згадзіўся зайсці... Чорт з ім! Станіслаў Нітка пойдзе, ён зробіць, што трэба»[6]. Гэты прыклад паказвае, як мова аўтара-апавядальніка (бо толькі ад яго можа зыходзіць іронія ў адносінах да «п'янчужкі Стася») незаўважна ператвараецца ва ўнутраную мову самога персанажа («хоць пайдзі ды зваліся пад плотам»).

Як бачым, ужо ў «Напярэдадні» Я. Брыль знайшоў дзейсныя сродкі для выяўлення аўтарскай асобы. Яны падрыхтавалі прыход у літаратуру брылеўскага лірычнага героя. У «Граніцы» такога героя пакуль яшчэ

няма; пісьменнік, відаць, так і не вырашыў, каму з персанажаў — Васілю Кужалевічу, у вобразе якога шмат аўтабіяграфічнага, ці больш актыўнаму і пераканальнаму Івану Дарме — даручыць вядучую ролю.

Адсутнасць у рамане адзінага галоўнага героя абвастрыла яшчэ адно прынцыповае пытанне: як дасягнуць кампазіцыйнай цэласнасці твора? Змена пунктаў погляду на падзеі толькі падкрэслівала раздробленасць эпізодаў-«кадраў», а ад падпарадкавання іх напружанаму сюжэту або строгай храналагічнай паслядоўнасці пісьменнік, як мы бачылі, адмовіўся; ён шукаў іншых сродкаў, больш адпаведных сваёй суб'ектыўна-лірычнай манеры апавядання. І тут Я. Брыль таксама робіць цікавыя знаходкі.

Пераходы з аднаго плана адлюстравання ў другі, рэзкія і механічныя, на першы погляд, часцей за ўсё апраўданы або асацыятыўнасцю аўтарскай думкі, або развіццём пачуцця, настрою. Напрыклад, паступовае нарастанне трагізму на працягу сямнаццаці раздзелаў «Напярэдадні» раптам перарываецца ледзь не анекдатычным апавяданнем пра тое, як Макар Костачка прыдбаў на кірмашы каня. Яно патрэбна Брылю не толькі для «разрадкі напружанасці»: народны аптымізм Макара перадаецца чытачу і рыхтуе жыццесцвярджальны фінал першай часткі рамана.

Досыць часта плынь апавядання накіроўваецца асацыяцыямі. У некаторых выпадках пісьменнік то літаральна «чапляе» пачатак новага раздзела за канец папярэдняга, то ўжывае кантрасную паслядоўнасць эпізодаў, то карыстаецца прыёмам рэтраспекцыі. Але асобныя плённыя знаходкі яшчэ не вырашылі праблему. Я. Брыль нястомна ўдасканальваў тэкст «Напярэдадні» (шліфаваў стыль; дадаваў новыя выразныя дэталі, пераглядаў сістэму дзеючых асоб), нават калі збіраўся публікаваць невялікі ўрывак (напрыклад, «Маладосць, што не скорыцца»[7]), і ўсё ж працягу першая частка рамана «Граніца» не атрымала.

Высветліць прычыны таго, што задума «Граніцы» не была ўвасоблена так, як уяўлялася пісьменніку спачатку, дапамагаюць аўтапрызнанні з цыклу лірычных запісаў «Свае старонкі». У 5-томным зборы твораў Я. Брыля яны пачынаюцца 1951 годам, гэта значыць праз два гады пасля надрукавання «Напярэдадні». Аўтар лічыць сваім абавязкам давесці абяцаны раман да канца. Аднак цяжкасці выканання гэтай задачы ўяўляюцца яму цяпер куды выразней, чым у 1947 годзе, калі ён дазваляў сабе жартаваць: «...перад тэмай «Граніцы» стаю, як дзядзька з мехам бульбы перад небаскробам»[8]. Сённяшні Брыль (1952) дадае: «Час ідзе, і на скронях ужо сівізна выступае, а я ўсё стаю, а падняцца мне з бульбай на соты паверх — абавязкова трэба. Ніякі тут ліфт не працуе, і гэта не жарты» (393). Ён здолеў паглядзець на сваю працу крытычна і прызнаць: «Усё, што дагэтуль сабрана для рамана, здаецца недастатковым, усё, што зроблена,— бедным, наіўным» (393).

З цягам часу творчы неспакой пісьменніка ўзмацняецца. Брыль меркаваў яшчэ больш пашырыць гарызонты рамана. Так, Дарма павінен быў стаць удзельнікам антыфашысцкага супраціўлення ў Іспаніі, Васіля Кужалевіча забіралі ў войска напярэдадні другой сусветнай вайны. Аўтар настойліва і мэтанакіравана збіраў матэрыял — у бібліятэках і архівах, у падарожжах і прыватных размовах, але нарэшце заўважыў, што гэта не вырашае праблему. У «Сваіх старонках» з'яўляецца трывожны запіс: «...найгорш — часамі здаецца, што ў мяне не засталося нічога, апроч жадання напісаць раман — ні розуму, ні пачуцця, ні жадання сказаць нешта новае... Ёсць, аднак, і тое, што трэба: сяды-тады здалёк выходзіць і просіцца на паперу сапраўднае, што хоча і мае права на жыццё» (394).

«Сапраўднае» для Брыля — гэта заўсёды тое, што ўласна адчута, перажыта, што стала набыткам яго эмацыянальнага вопыту. Калі гэтага не хапае, дакументальны вопыт у стане яго дапоўніць, але не замяніць. І вось праца над «Граніцаю» спынілася, таму што супярэчнасць паміж першапачатковай задумай «вялікага эпічнага палатна» і асаблівасцямі

творчай індывідуальнасці пісьменніка, прызвычаенага да адлюстравання жыцця з лірычных пазіцый («праз сябе»), дасягнула максімальнага абвастрэння. Зрабілася відавочным: для таго каб стварыць свой раман, Я. Брылю трэба грунтавацца на самым блізкім яму, добра вядомым матэрыяле, не спакушацца грандыёзнымі маштабамі, не ламаць сваю мастацкую манеру, а шукаць сродкаў лірычнага пераўтварэння раманнага жанру.

Для такой наватарскай працы пісьменнік у пачатку 50-х гадоў быў яшчэ не гатовы. У «Напярэдадні» ён зрабіў толькі першую спробу пабудаваць вялікі празаічны твор з такім сюжэтам, які па сутнасці ўяўляе сабою «суцэльную кампазіцыю» (А. Яскевіч). Тагачасная крытыка не падтрымала мастацкіх пошукаў Я. Брыля. Таму ён вырашыў часова спыніць работу над раманам, набрацца неабходнага творчага вопыту.

Прыкладна праз дзесяць год ён напіша свой раман — «Птушкі і гнёзды». А лёс «Граніцы» склаўся ў пэўнай ступені нечакана.

На працягу пятнаццаці год Я. Брыль зусім не друкаваў пачаты калісьці раман, і толькі ў 1967 годзе ён уключыў яго ў свой Збор твораў у чатырох тамах. Для яго аповесць «Напярэдадні» была перапрацавана ў «раздзелы з рамана». Аўтар скараціў публіцыстычныя адступленні і ўсе эпізоды, звязаныя з дзейнасцю камуністычнага падполля, зняў прысвячэнне В. Таўлаю (яно мела б сэнс перад завершаным творам), прыглушыў палітычную плакатнасць. Ён пакінуў толькі тыя ўрыўкі, якія лічыў вартымі свайго таленту і ўвагі чытачоў, і такім чынам канчаткова ўзгадніў фрагментарную пабудову твора і яго жанравую спецыфіку — калі можна назваць жанравай разнавіднасцю «раздзелы з рамана». Аднак для гэтага ён выбраў нібы адваротны шлях, зрабіў дробнасць кампазіцыі максімальнай. Магчыма, пісьменнік паступіў так таму, што не хацеў парушаць сувязь «Граніцы» з часам яе ўзнікнення і адпаведным узроўнем свайго майстэрства: магчыма, таму што задума ўжо адышла вельмі далёка, перастала непакоіць. Нарэшце, адносіны Я. Брыля да вялікай прозы пасля «Птушак і гнёздаў» і «Жмені сонечных промняў» таксама змяніліся. Шматтомныя творы здаюцца яму цяпер несучаснымі.

[1] Гл.: Брыль Я. Граніца: Урывак з першай кнігі рамана // Літаратура і мастацтва. 1948. 29 мая.
[2] Гл.: Уступнае слова да ўрыўка «У пастарунку» // Беларусь. 1948. № 10. С. 22.
[3] Полымя. 1949. № 5.
[4] Усе імёны дзеючых асоб даюцца па зборніку: Брыль Я. Вераснёвая рунь. С. 112.
[6] Там жа. С. 24.
[7] Гл.: Брыль Я. Дзеля сапраўднай радасці. Мінск, 1952.
[8] Брыль Я. Збор твораў: У 5 т. Мінск, 1982. Т. 5. С. 393. Далей цытаты даюцца па гэтаму выданню ў тэксце з указаннем старонак у дужках.

А. А. ЯСКЕВІЧ

## ВЫТОКІ БЕЛАРУСКАЙ БАЛАДЫ

Даследаванне генезісу беларускай балады пераконвае, што яна ў сваім станаўленні абапіралася не толькі на багатую нацыянальную спадчыну, але паспяхова выкарыстоўвала і дасягненні сусветнай літаратуры.

Паводле вызначэння Л. М. Салавей, беларуская народная балада — жанр ліра-эпічны з дастаткова выяўленымі элементамі драматызацыі апавядання. Да стылёвай адметнасці беларускай фальклорнай балады даследчык адносіць натуральнасць яе апавядання, ашчаднасць выяўленчых сродкаў. Побач са сціслым, амаль схематычным выкладаннем дапускаюцца мерная дэталізацыя, элементы апісальнасці, паўторы, часам малююцца абразкі роднай прыроды, працы і быту чалавека, што, на погляд даследчыка, перанята з абрадавай паэзіі [1].